І.Ф.Чарняўская

# ПРА ПАШЫРЭННЕ ПЕДАГАГІЧНАГА РЭПЕРТУАРУ НАСТАЎНІКА МУЗЫКІ Ў ПЕРЫЯД АДРАДЖЭННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ

Галоўная задача, якая стаіць перад настаўнікам музыкі сёння - узняць узровень музычнай культуры падрастаючага пакалення, абудзіць цікавасць да багатай музычнай спадчыны нашай Бацькаўшчыны. Школьнай праграмай па прадмеце "Музыка" прадугледжваецца далучэнне дзяцей як да класічнай, так і да сучаснай музыкі. Аднак у перыяд адраджэння нацыянальнай культуры Беларусі адной з найбольш актуальных задач настаўніка музыкі з'яўляецца азнаямленне школьнікаў з багатым і цікавым пластом музычнай культуры - музыкай свайго народа.

У школьнай хрэстаматыі па музыцы прадстаўлены творы беларускіх кампазітараў, аднак для творчага настаўніка праграмныя рамкі становяцца цесныя і скоўваюць яго ініцыятыву. Акрамя таго, беларуская музыка пастаянна абагачаецца новымі самабытнымі, незвычайнымі, яркімі творамі, а на музычным даляглядзе паяўляюцца маладыя таленавітыя кампазітары. Настаўнік - асветнік, прапагандыст прызваны сёння дапамагчы дзецям і юнацтву зарыентавацца ў сучаснай культуры, вылучыць у музычным патоку толькі сапраўды мастацкае, значнае, вечнае.

У сувязі з гэтым унікальнасць працы настаўніка музыкі заключаецца ў тым, што яму трэба няспынна папаўняць свой рэпертуар, пашыраць рэпертуар педагагічны. Педагогу-музыканту неабходна свабодна арыентавацца ў разнастайнасці сучаснай музыкі, аргументавана адзначаць высокамастацкія і ярка-своеасаблівыя творы, умець выяўляць педагагічны патэнцыял твораў розных стылёвых напрамкаў.

Разам з тым вопыт работы паказвае, што менавіта кваліфікаваны адбор музычнага матэрыялу стварае найбольшыя цяжкасці для маладога настаўніка. Гэта прадвызначае недастатковае выкарыстанне на уроках музыкі твораў сучасных, у прыватнасці беларускіх, аўтараў. Такое становішча з'яўляецца адной з агульнапрызнаных прычын нізкай цікавасці дзяцей да музычнага мастацтва ў цэлым.

У нашы дні школа чакае магістра мастацтваў, здольнага творча апрацаваць і скампанаваць вучэбны матэрыял. Настаўнік павінен быць падрыхтаваны да гібкага аперыравання педагагічным рэпертуа-



Рэпазіторый БДПУ

рам і яго пашырэння. Аналіз педпрактыкі паказвае, што сённяшні настаўнік, які прызваны вырашаць задачу фарміравання музычнай культуры моладзі суверэннай Рэспублікі Беларусь, павінен умець прафесійна выяўляць увесь спектр педагагічнага ўздзеяння, развіццёвыя магчымасці музычных твораў. У прыватнасці, вызначаць варыянты выкарыстання твора для метадычнага вырашэння задач вучэбнага працэсу і ў розных мэтах музычнай адукацыі, для раскрыцця тэм школьнай праграмы і правядзення пазакласных мерапрыемстваў, выкарыстоўваць пэўны твор для ўзмацнення эмацыянальнага ўздзеяння і, нарэшце, адбіраць творы з улікам узроставых ды індывідуальных асаблівасцяў мяркуемай аўдыторыі.

Адна з самых актуальных задач падрыхтоўкі будучага настаўніка музыкі - навучыць студэнтаў складаць высокамастацкі педагагічны рэпертуар для ажыццяўлення педагагічнай работы ў школе, імкнуцца, каб творы, якія вывучаюцца на індывідуальных занятках па музычных дысцыплінах, успрымаліся ў кантэксце будучай прафесійнай дзейнасці.

Шматгадовы педагагічны вопыт паказвае, што для вырашэння гэтай задачы трэба прывучыць студэнтаў разглядаць кожны вывучаемы твор з пазіцый яго педагагічнай мэтанакіраванасці. Важна, каб складанне музычнага рэпертуару было педагагічна накіраваным, факусіраваным на тэмы школьнай праграмы і задачы дзейнасці настаўніка музыкі. У вучэбным працэсе трэба наглядна і аргументавана раскрываць канкрэтныя перспектывы і варыянты практычнага прымянення вывучаемых твораў.

Дасягненню гэтай мэты садзейнічае выкарыстанне ў працэсе навучання спецыяльных заданняў, разлічаных на рэгулярнае ўключэнне ў вучэбны працэс усіх курсаў. У змест заданняў павінны быць уведзены элементы найбольш тыповых педагагічных задач, якія вырашаюцца настаўнікам пры адборы і кампаноўцы музычнага матэрыялу для правядзення школьнага ўрока або пазакласнага мерапрыемства.